# ОБРАЗОВАНИЕ, РЕЛИГИЯ И КУЛЬТУРА

*А.Р. Агееў* (г. Магілёў, Беларусь)

## ПРАЦА ПЕРШАГА ДЫРЭКТАРА МАГІЛЁЎСКАГА НАСТАЎНІЦКАГА ІНСТЫТУТА У.М. ТЫЧЫНІНА ВА ЎСТАНОВАХ ДУХОЎНАГА ВЕДАМСТВА

Пачатак мінулага стагоддзя быў часам хуткага павялічэння колькасці пачатковых школ у Расійскай імперыі, што выводзіла пытанне паляпшэння сістэмы падрыхтоўкі настаўнікаў у разрад першачарговых. У 1913 г. быў адкрыты настаўніцкі інстытут ў Магілёве, а пры ім двухкласнае гарадское вучылішча, у якім студэнты праходзілі педагагічную практыку. Дырэктарам інстытута быў прызначаны стацкі саветнік У.М. Тычынін, якому ўдалося за кароткі тэрмін сфарміраваць штат інстытута, стварыць яго матэрыяльную базу, арганізаваць складанне нарматыўных і метадычных дакументаў і сам навучальны працэс. Да апошняга часу даінстытуцкая біяграфія Тычыніна была нам практычна невядомай. Дзе нарадзіўся, працаваў, чым захапляўся, як удалося першаму кіраўніку ўстановы так хутка наладзіць працу і паспяхова кіраваць інстытутам да 1918 г.? На ўсе гэтыя пытанні не маглі даць адказы архіўныя дакументы Беларусі. Знаходка ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве фармулярнага спісу і іншых дакументаў асабістай справы Тычыніна дазволіла праліць святло на многія старонкі ягонай біяграфіі [2, л. 23].

Нарадзіўся будучы дырэктар у Арлоўскай губерні ў 1862 г. Па заканчэнню курса Арлоўскай духоўнай семінарыі ў 1883 г. са званнем студэнта Уладзімір Тычынін пачаў сваю працу на ніве адукацыі 19 жніўня 1883 г. ў Прадцечаўскай земскай школе Арлоўскай губерні. Працаваў ён настаўнікам крыху больш за год па 26 верасня 1884 г. Затым малады настаўнік працягнуў сваю адукацыю ў знакамітай Маскоўскай духоўнай акадэміі. Першая вышэйшая школа Расіі была заснавана ў 1685 г. і заставалася найбуйнейшым цэнтрам развіцця праваслаўнай навукі і адукацыі Рускай Праваслаўнай Царквы. У напачатку XIX ст. яна была пераведзена з Масквы у Свята-Траецкую Сергіеву Лаўру. У такой вядомай і аўтарытэтнай установе давялося вучыцца Тычыніну. Акадэмія забяспечыла грунтоўнасць ягонай адукацыі. Ён падтрымліваў добрыя адносіны з сваімі сябрамі па акадэміі доўгія гады, аб чым сведчаць успаміны ягонага аднакурсніка Глубакоўскага [1].

Па заканчэнню курса акадэміі ў 1888 г. са ступенню кандыдата багаслоўя Уладзімір Мікалаевіч 14 студзеня 1889 г. паступіў на службу выкладчыкам славеснасці і грамадзянскай гісторыі Арлоўскага епархіяльнага жаночага вучылішча. У наступным навучальным годзе з 8 верасня ён выкладаў рускую і царкоўна-славянскую мовы. Адпрацаваўшы два з паловай гады ў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жаночай навучальнай установе, ён развітаўся з роднай Арлоўшчынай і ў 1891 г. пераехаў на беларускія землі. 17 кастрычніка ён быў прызначаны настаўнікам лацінскай мовы ў Віцебскае мужчынскае духоўнае вучылішча. У вучылішчы яму давялося выкладаць таксама геаграфію, рускую і царкоўнаславянскую мову, быць членам камісіі па прыёмцы ў эксплуатацыю і рамонту будынка вучылішча, з лета 1894 па 1895 г. выконваць абавязкі памочніка наглядчыка вучылішча. Толькі стаўшы на ногі Уладзімір Мікалаевіч змог дазволіць сабе 29 чэрвеня 1892 г. ажаніцца на Любові Фёдараўне Паповай, 1865 г. нараджэння, праваслаўнага веравызнання. [2, л. 23] У 1895/95 навучальным годзе Тычынін выкладаў славеснасць і рускую літаратуру ў Полацкім жаночым духоўным вучылішчы. У 1896/97 навучальным годзе выкладаў грамадзянскую гісторыю і педагогіку, а таксама назіраў выкладанне гадаванкамі старшага класа вучылішча ва ўзорнай царкоўнапрыходскай школе пры тым жа вучылішчы.

У пачатку 1897 годзе ў жыцці Тычыніна адбыліся важныя і, відаць, прыемныя змены. Яму даверылі самастойны ўчастак працы. 31 студзеня 1897 г. ён быў прызначаны наглядчыкам Віцебскага духоўнага вучылішча. Гэта быў значны кар'рны рост і пераход на больш высокую жыццёвую арбіту. Амаль адначасова 1 лютага за выслугу лет Уладзіміра Мікалаевіча "произвели" ў калежскія саветнікі, 6 мая "за отлично-усердную и полезную службу" узнагародзілі ордэнам Св. Станіслава 3-й ступені. Акрамя выканання абавязкаў па кіраўніцтву ўсёй навучальна-выхаваўчай і гаспадарча-адміністрацыйнай працай духоўнага вучылішча, дырэктар выкладаў мовы ды іншыя прадметы, актыўна працаваў у епархіяльных органах. Ён быў членам і справаводам з 1893 па 1898 г. Віцебскага аддзялення Полацкага епархіяльнага вучылішчнага савета, членам ягонага школьнага камітэта з 1903 г., членам камісіі па пабудове будынка Полацкага жаночага духоўнага вучылішча і г.д.

Паралельна з працай у вучылішчы Тычынін вёў актыўную грамадскую дзейнасць. Ён абіраўся і зацвярджаўся членам савета і членам рэвізійнай камісіі па праверцы грашовых сум Віцебскага Св. Уладзіміраўскага брацтва з 1 сакавіка 1897 па 20 студзеня 1910 г., членам рэвізійнага камітэта па праверцы грашовай справаздачнасці Таварыства ўзаемадапамогі настаўнікаў і настаўніц народных школ Віцебскай губерні, заснаваў і быў скарбнікам "Таварыства дапамогі навучэнцам Віцебскага духоўнага вучылішча, якім патрэбна дапамога", членам рэвізійнай камісіі па праверцы грашовай справаздачнасці Віцебскага аддзялення Місіянерскага таварыства і г.д.

Актыўна ўдзельнічаў Уладзімір Мікалаевіч і ў дзейнасці Імператарскага праваслаўнага палесцінскага таварыства, якое было створана ў 1882 г. указам імператара Аляксандра III для "садзейнічання праваслаўнаму паломніцтву ў Святую зямлю, навуковаму палесціназнаўству і гуманітарнаму супрацоўн-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

іцтву з народамі краін біблейскага рэгіёна". Ён стаў пажыццёвым супрацоўнікам і скарбнікам Віцебскага аддзялення Імператарскага Праваслаўнага Палесцінскага Таварыства. З'ездамі полацкага духавенства Тычыніна не раз прадстаўлялі да заахвочвання. У 1901 г. "за отлично – усердную и полезную службу" яго ўзнагародзілі ордэнам Св. Ганы і "произвели" ў стацкія саветнікі [2, л. 22-29]. Пастулова ён стаў вядомым на Беларусі педагогам, рэгулярна друкаваўся ў газетах, педагагічных часопісах, лічыўся прадстаўніком "прагрэсіўнай педагогікі".

Праверкі паказвалі узорнае стан спраў у Віцебскім духоўным вучылішчы. У справаздачы па рэвізіі 1899 г. стацкага саветніка члена вучэбнай камісіі пры Св. Сінодзе Нечаева Тычынін характарызуецца, як "способный, старательный н распорядительный" наглядчык вучылішча [2, л. 26]. Невыпадкова ў 1911 г. Тычыніна прызначылі дырэктарам Свіслачскай семінарыі. Напярэдадні прызначэння канцылярыя Апекуна Віленскай навучальнай акругі збірала неабходныя дакументы і характарыстыкі на Уладзіміра Мікалаевіча. Красамоўна адлюстроўвае ягоную працу і аўтарытэт характарыстыка, якую ў жніўні 1910 г. яму даў непасрэдны начальнік па духоўнаму ведамству епіскап Серафім: "...безукоризненно честный и нравственный человек, благожелательный и способный педагог, осторожный и заботливый хозяин. Училище поставлено им прекрасно во всех отношениях. Препятствий к перемещению г. Тычинина на службу по ведомству Народного просвещения не имеется..." [2, л. 10А]

За узорную службу Тычынін меў шматлікія падзякі і ўзнагароды. У адпаведнасці з даведкай для "Памятной книжки Виленского учебного округа на 1913-1914 уч. год" дырэктар інстытута стацкі саветнік кандыдат маскоўскай духоўнай акадэміі Уладзімір Мікалаевіч Тычынін быў у 1913 г. чыноўнікам 5 класа і быў ужо ўзнагароджаны ардэнамі св. Ганны 2-й і 3-й ступеняў, св. Станіслава 2-й і 3-й ступеняў , бібліяй ад Святога Сіноду, залатым знакам Чырвонага крыжа, залатым і бронзавым знакамі Імператарскага Палястынскага праваслаўнага таварыства, срэбным медалём у памяць царствавання Імператара Аляксандра III і срэбным медалём у памяць 25-ці годдзя Імператара Мікалая II. Цалкам заканамерным у святле знойдзенных намі і апісаных фактаў біяграфіі У.М. Тычыніна з'яўляецца яго прызначэнне на пасаду дырэктара Магілёўскага настаўніцкага інстытута і паспяховая дзейнасць на ёй.

### Літаратура

1. *Глубоковский Н.Н.* Автобиографические воспоминания (МДА. Софийский архив Н.Н. Глубоковского) // http://www.bogoslov.ru/bogoslov/publication/glubokovskiy.html.
2. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. – ф. 567, воп. 17, спр. 987.
3. *Агееў А.Р.* Першыя выкладчыкі і настаўнікі ў гісторыі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова // Веснік МДУ імя А.А. Куляшова. – 2003. – № 4. – С. 241–248.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова